**Праект**
**філіяла “Дзіцячая  бібліятэка”**
**па рабоце з дзецьмі**
**з абмежаванымі магчымасцямі здароўя**
**“Ты ў гэтым свеце не адзін”**
**на 2023 год**

## I. Абгрунтаванне праекта:

Дзеці ў Беларусі з’яўляюцца вялікай каштоўнасцю і прыярытэтнай для бібліятэк групай. Асаблівага падыхода ў гэтым плане патрабуюць дзеці з абмежаваным магчымасцямі здароўя, жыццё гэтых дзяцей ідзе ў складаных умовах, яно вельмі адрозніваецца ад вобраза жыцця і выхавання здаровых дзяцей.

Роля бібліятэкі ў жыцці асаблівых дзяцей вельмі важная. Для многіх з іх свет адкрываецца менавіта праз кнігу, якая заўсёды лічылася адным з сувязных звенняў паміж людзьмі пры перадачы жыццёвага вопыта. Кніга лечыць, падтрымлівае чытача, гарманізуе яго ўнутраны свет – і для такіх чытачоў бібліятэкі прадастаўляюць свае фонды.

Іншым дзецям, якія па шэрагу абставін не могуць чытаць самастойна і ўспрымаць прачытанае ўслых, бібліятэка дае магчымасць зносін з аднагодкамі і бібліятэкарамі. Прыцягвае іх да пасільнага ўдзелу ў разнастайных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў бібліятэцы, арганізоўвае мерапрыемствы спецыяльна для такіх дзетак. Гэта ў пэўнай ступені папаўняе дэфіцыт дабрыні, дапамагае дзецям змагацца з пачуццём адзіноты, непаўнацэннасці. Для сваіх асаблівых чытачоў бібліятэка імкнецца стварыць магчымасць для развіцця, задавальнення іх духоўных і пазнавальных запатрабаванняў.

Бібліятэка як сацыяльны інстытут на сучасным этапе прызвана арганізоўваць умовы для бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, садзейнічае іх адукацыйнаму працэсу, творчаму і духоўнаму развіццю асобы, садзейнічае працэсу інтэграцыі гэтых дзяцей у грамадстве, забяспечвае атрыманне неабходнай інфармацыі ў розных галінах ведаў.

Адным з найбольш актуальных накірункаў праекта з’яўляецца рэабілітацыя дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

У час рэалізацыі праекта з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя будуць выкарыстоўвацца разнастайныя формы работы, гульнёвыя праграмы, конкурсы, літаратурна-музычныя кампазіцыі, экскурсіі і інш.

## II. Мэта праекта:

Сацыяльная адаптацыя дзяцей-інвалідаў у сучасным грамадстве, садзейнічанне гарманічнаму развіццю асобы дзіцяці.

## III. Задачы праекта:

1. Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя;

2. Стварэнне ўмоў для развіцця духоўных і пазнавальных патрэб асаблівых дзяцей;

3. Прадастаўленне асаблівым дзецям магчымасці зносін з аднагодкамі;

4. Пошук новых форм і метадаў у рабоце з асаблівымі дзецьмі і іх бацькамі.

## IV. Партнёры бібліятэкі ў рэалізацыі праекта:

Карэкцыйныя 1 - 9 класы Астравецкага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

## V. Асноўныя мерапрыемствы:

1. “Угадай героя сказки”: віктарына-гумарына
студзень адказ. Н. І. Козіч
Л. М. Сакалоўская

2. “Подарите книги детям!”: акцыя (да Міжнароднага дня дарэння кніг)
люты адказ. Н. І. Козіч
Л. М. Сакалоўская

3. “В гостях у киносказки”: дзень анімацыі
сакавік адказ. Н. І. Козіч
Л. М. Сакалоўская

4. “Поможем пернатым выжить”: акцыя
красавік адказ. Н. І. Козіч
Л. М. Сакалоўская

5. “Астравецкі край у творчасці пісьменнікаў”: літаратурна-краязнаўчы агляд
май адказ. Л. М. Сакалоўская

6. “Добрый день, школа!": падарожжа ў краіну ведаў
верасень адказ. Н. І. Козіч
Л. М.Сакалоўская

7. “Папа, ты лучший на свете!”: гульнёвая праграма
кастрычнік адказ. Н. І. Козіч
усе супрацоўнікі бібліятэкі

8. “Без сказок становится скучно”: казачны мактэль
лістапад адказ. Н. І. Козіч
Л. М. Сакалоўская

9. “С Новым годом!”: навагодняе канфеці
снежань адказ. Н. І. Козіч

Л. М. Сакалоўская

В. а. заг. філіяла “Дзіцячай бібліятэкі”: Л. М. Сакалоўская

Намеснік дырэктара Астравецкага РЦКРНіР: А. А. Ярашэвіч